Вераскаве: шлях з мінулага ў будучыню» на несколько месяцев объединила учащихся VII—XI классов, преподавателей истории, белорусского языка и литературы, музыки, информатики, трудового обучения гимназии № 1 г. Новогрудка, сотрудников учреждений культуры Новогрудского района, разные поколения выпускников Вересковской средней школы и их учителей, местных жителей. Проект и презентация проекта нашей команды «Мы — новагародцы» были признаны одними из лучших в Гродненской области.

В 2013 году учащиеся VIII—X классов стали победителями районного конкурса юных экскурсоводов (номинации «Гісторыя аднаго экспаната» и «Музей у чамадане») и Республиканского конкурса «Мясціны майго дзяцінства» в рамках Республиканской акции «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся». Результатом проектно-исследовательской деятельности в краеведческом направлении явился медиапроект «Мая Навагрудчына».

В мае 2014 года учащийся IX класса Владислав Бородин (тема «По следам армии генерала Андерса») был удостоен Диплома III степени на VII Международной молодёжной научно-практической конференции «Великая Отечественная война 1941—1945 годов в исторической памяти народа».

Организация проектно-исследовательской деятельности учащихся в образовательном процессе происходит наиболее эффективно, если создана соответствующая социально-образовательная среда.

Грамотно организованная проектно-исследовательская деятельность ориентирует учащихся на овладение способами учебно-познавательной активности (умения работать с различными информационными источниками, анализировать, обобщать, устанавливать причинно-следственные связи, делать выводы). Участие в конференциях, конкурсах приучает школьников быть ответственными, способствует повышению их авторитета в ученическом коллективе и самореализации.

Проектно-исследовательские технологии позволяют обучающимся стать участниками творческого процесса, а не пассивными потребителями готовой информации, повышают их познавательную активность и интеллектуальный потенциал, развивают воображение, интуицию, потребность в самоактуализации, раскрывают и расширяют созидательные возможности.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Біябібліяграфічныя рэсурсы дзіцячых і школьных бібліятэк

*А. Ю. Казленка*

**У артыкуле разглядаюцца асноўныя мэты і формы функцыянавання біябібліяграфічных рэсурсаў, рэалізацыі якіх ва ўмовах дзіцячых і школьных бібліятэк перашкаджае недастатковая запатрабаванасць у грамадстве. Надзённае пытанне — іх эфектыўная папулярызацыя з акцэнтам на функцыянальны патэнцыял. Неабходным з'яўляецца таксама прынящце актыўнай творчай пазіцыі бібліятэкарамі, бібліёграфамі і выкладчыкамі.**

**The main objectives and forms of functioning of the bibliographic resources, realization of which in the conditions of of children's and school libraries hampered by insufficient demand in society, are discussed in the article. Today effective popularization with an emphasis on functional capacity is required. It is also necessary to take active creative position of librarians, bibliographers and teachers.**

**Ключавыя словы:** біябібліяграфічныя рэсурсы, бібліяграфія для дзяцей і юнацтва, біяграфіі, персаналіі.

**Keywords:** biobibliographic resources, bibliography for children and youth, biographies, personalities.

*Функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі для дзяцей і юнацтва абумоўлена найперш яе педагагічнай скіраванасцю на дапамогу ў выхаванні, адукацыі і самаадукацыі, папулярызацыю ведаў. Асноўная работа па інфармаванні дзяцей і юнацтва аб новай і карыснай для іх літаратуры ўскладзена на дзіцячыя і школьныя бібліятэкі (апошні выпуск бібліяграфічнага паказальніка «Дзіцячая літаратура Беларусі. 1996–2000 гг.» выйшаў у 2007 годзе).*

Своечасова паведамляць пра цікавыя рэсурсы для дзяцей бібліятэкам дазваляе выкарыстанне найноўшых інфармацыйных тэхналогій: гэта і падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў на CD-ROM, і размяшчэнне бібліяграфічнай інфармацыі, рэкамендацый на сайтах бібліятэк ці ў адпаведных суполках сацыяльных сетак. Сёння назіраецца адраджэнне бібліяграфіі для дзяцей і юнацтва ў новых цікавых формах. Актуалізуюцца змест, мэты, формы і тыпы бібліяграфічных крыніц, іх методыка і мастацкае афармленне, узмацняецца іх сацыяльная значнасць.

Мэтай сучаснай бібліяграфіі для дзяцей і юнацтва з'яўляецца ажыццяўленне такіх найважнейшых функцый, як трансляцыйная, або развіваючая (сацыяльны, духоўны, культурны рост дзіцяці ў сувязі з яго асобасным і творчым развіццём), і адукацыйная, у тым ліку фарміраванне інфармацыйнай культуры асобы [1, с. 74]. На жаль, іх рэалізацыі перашкаджаюць недастатковая папулярнасць і запатрабаванасць у грамадстве бібліяграфіі для дзяцей і юнацтва, што датычыцца не толькі бібліяграфічных звестак адносна навуковапазнавальнай літаратуры, уключанай у школьную праграму, але і інфармавання аб іншых значных у адукацыйным працэсе напрамках (выбар прафесіі, дасягненні навукі і тэхнікі, краязнаўства, жыццё выдатных дзеячаў і інш.).

Напрыклад, біябібліяграфічная інфармацыя, якая мае сваім сутнасным аб'ектам інтэлектуальную спадчыну творчай асобы (асоб), калектыву аўтараў, што ўзнаўляецца бібліяграфічнымі сродкамі, сёння мала выкарыстоўваецца ў дзіцячых і школьных бібліятэках. Толькі лічаныя фонды ўтрымліваюць біябібліяграфічныя слоўнікі.

У шырокім сэнсе выкарыстанне біябібліяграфічнай інфармацыі дазваляе карыстальніку арыентавацца ў гісторыі культуры, навукі, атрымліваць веды пра іх знакамітых прадстаўнікоў, садзейнічае яго асобаснай самарэалізацыі і самаідэнтыфікацыі.

Артыкул у біябібліяграфічным выданні будуецца на аснове сінтэзу інфармацыі пра творы і біяграфічных звестак пра аўтара і літаратуру, прысвечаную яму. З аднаго боку, дзейнасць той ці іншай творчай асобы (калектыву), навуковай суполкі індывідуалізуецца, а з другога — упісваецца ў кантэкст культурнагістарычнага развіцця краіны і свету ў цэлым. Такім чынам адбываецца далучэнне карыстальніка да духоўных каштоўнасцей мінулага і сучаснага, на гуманістычнай аснове фарміруецца яго культура, выхоўваецца самастойнае мысленне.

Функцыянаванне біябібліяграфічнай інфармацыі мае на мэце арыентацыю на развіццё інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу чалавека, яго пазнавальных здольнасцей, крэатыўнасці, умацаванне духоўнага здароўя. Разуменне гэтай мэты стварае падмурак для дзейнасці супрацоўнікаў бібліятэк, у тым ліку дзіцячых, скіраванай

**Выкарыстанне біябібліяграфічнай інфармацыі дазваляе карыстальніку арыентавацца ў гісторыі культуры, навукі, атрымліваць веды пра іх знакамітых прадстаўнікоў, садзейнічае яго асобаснай самарэалізацыі і самаідэнтыфікацыі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на шматаспектнае выкарыстанне і падрыхтоўку бібліяграфічных рэсурсаў.

Яскравымі прыкладамі біябібліяграфічных рэсурсаў для дзіцячых бібліятэк з'яўляецца шэраг электронных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: «Паэт красы і гармоніі: да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891—1917)», «"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай ...": да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840—1900)» і інш.

Варта адзначыць таксама рэсурсы абласных бібліятэк: біябібліяграфічны паказальнік «Лауреаты Нобелевской премии» (Брэст, 2004), бібліяграфічны паказальнік «Спавядальнае слова» (Гомель, 2010), біябібліяграфічны паказальнік «Алесь Каско» (Брэст, 2013) і інш.

Сярод вядомых грунтоўных прац трэба ўзгадаць знакаміты шасцітомны біябібліяграфічны слоўнік «Беларускія пісьменнікі» (Мінск, 1992—1995).

Дастаткова шырокае распаўсюджанне атрымалі персанальныя паказальнікі, прысвечаныя беларускім класікам: Якубу Коласу, Янку Купалу, Максіму Багдановічу і іншым. І ўсё ж, нягледзячы на пэўныя дасягненні, да гэтага часу не складзены паказальнікі пра пісьменнікаў, значная частка творчасці якіх адрасавана менавіта дзецям і падлеткам (Я. Маўр, А. Якімовіч, С. Шушкевіч, Э. Агняцвет і інш.) [2, с. 86].

Плёнам працы супрацоўнікаў Гомельскай бібліятэкі стала новая форма прадстаўлення біябібліяграфічнай інфармацыі — віртуальныя музеі аднной асобы (прысвечаныя, напрыклад, Б. Сачанку, А. Макаёнку, І. Мележу, І. Шамякіну), даступныя праз Інтэрнэт.

Акрамя таго, сёння амаль кожная дзіцячая і школьная бібліятэка валодае біябібліяграфічнымі рэсурсамі для ўласнага карыстання — гэта картатэкі, базы дадзеных, памяткі і невялікія біябібліяграфічныя паказальнікі, надрукаваныя малым тыражом. Прыклад таму — электронная база дадзеных «Сучасная беларуская літаратура» Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска.

Істотнае значэнне ў межах бібліятэчнай дзейнасці мае пошукавая функцыя біябібліяграфічных крыніц. З іх дапамогай карыстальнікі атрымліваюць разнастайную даведачную інфармацыю. Асабліва каштоўнымі з'яўляюцца тыя рэсурсы, што рэдагаваліся самім аўтарам (калектывам), бо ў такім выпадку ўсе запісы будуць сапраўды выверанымі.



*Алена Юр'еўна Казленка,*
*кандыдат педагагічных навук,*
*старшы выкладчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Пошук пэўных фактаў з жыцця творцаў — надзённая праблема для наведвальнікаў бібліятэк, асабліва калі гэтыя звесткі не ўнесены ў энцыклапедычныя і даведачныя выданні. Таму бібліёграфам важна фіксаваць і вызначаць пункты доступу да біябібліяграфічнай інфармацыі ў фондах бібліятэк і ў Інтэрнэце.

Біябібліяграфічная інфармацыя можа выступаць у якасці асновы для падрыхтоўкі тэматычных і краязнаўчых рэсурсаў. Шматперсанальныя біябібліяграфічныя даведнікі і даведнікі, прысвечаныя калектывам, могуць выкарыстоўвацца пры складанні паказальнікаў пра адну асобу. Акрамя таго, велізарны пласт біябібліяграфічнай інфармацыі ў выглядзе юбілейных артыкулаў у прафесійных і навукова-папулярных часопісах садзейнічае ўсведамленню бібліёграфамі неабходнасці ў паглыбленым вывучэнні жыцця і дзейнасці творчых асоб,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Наяўнасць поўнай біябібліяграфічнай інфармацыі палягчае падрыхтоўку ў бібліятэцы масавых мерапрыемстваў кшталту юбілейнага вечара аўтара, сустрэчы з паэтам ці празаікам, прэзентацыі новага твора. Пры гэтым біябібліяграфічны рэсурс становіцца важным элементам тэматычнай кніжнай выстаўкі.**

фарміраванні на гэтай падставе самастойных біябібліяграфічных рэсурсаў.

Наяўнасць поўнай біябібліяграфічнай інфармацыі палягчае падрыхтоўку ў бібліятэцы масавых мерапрыемстваў кшталту юбілейнага вечара аўтара, сустрэчы з паэтам ці празаікам, прэзентацыі новага твора. Пры гэтым біябібліяграфічны рэсурс становіцца важным элементам тэматычнай кніжнай выстаўкі. Сцэнарый мерапрыемства павінен уключаць выступленне складальнікаў біябібліяграфічнага прадукту, экспазіцыю часопісных артыкулаў і іншых прац творцы ці калектыву, выстаўку фатаграфій з іх архіваў і г. д. Пажаданай з'яўляецца прысутнасць на прэзентацыі самога аўтара (суполкі). Калі ж такой магчымасці па нейкіх прычынах няма, запрашаюцца сваякі, калегі, даследчыкі творчай спадчыны ці іншыя зацікаўленыя асобы.

Сярод формаў правядзення культурна-забаўляльных праграм у дзіцячай ці школьнай бібліятэцы, калі магчыма ярка выявіць патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі, адзначым таксама літаратурныя вечары, чытацкія клубы, вечары памятных дат. Так, літаратурны вечар пашырае і паглыбляе веды дзяцей і падлеткаў пра жыццё і творчасць пісьменніка, яго літаратурнае асяроддзе, эпоху, стварае больш поўнае і эмацыйна афарбаванае ўяўленне пра творчую асобу, садзейнічае разуменню ўдзельнікамі мерапрыемства значэння яе дзейнасці. Менавіта біябібліяграфічныя паказальнікі становяцца крыніцамі пошуку матэрыялаў для літаратурных вечароў. Цікавым вопытам могуць быць святы па пэўных літаратурных кірунках, прысвечаныя, напрыклад, пісьменнікам-фантастам, дзіцячым пісьменнікам і інш. Ва ўмовах працы чытацкага клуба наяўную ў бібліятэцы біябібліяграфічную інфармацыю можна дапаўняць звесткамі пра сучасных і малавядомых творцаў — сяброў клуба.

Шырока выкарыстоўваюцца біябібліяграфічныя рэсурсы і ў выставачнай дзейнасці дзіцячых і школьных бібліятэк, асабліва персанальнага і краязнаўчага напрамку. Так, у біябібліяграфічных даведніках звесткі пра аўтара ці калектыў сістэматызуюцца па пэўных перыядах, гэты ж прынцып можа стаць асновай для афармлення стэндаў экспазіцыі. На краязнаўчай выстаўцы дзіцячай бібліятэкі неабходна найбольш поўна раскрыць і адлюстраваць лёсы знакамітых людзей, якія зрабілі вялікі ўнёсак у навуку і культуру краіны.

Стваральнікі біябібліяграфічных рэсурсаў і бібліятэкары павінны праводзіць работу па іх папулярызацыі сярод настаўнікаў і навучэнцаў, удзельнічаць у падрыхтоўцы адпаведных метадычных дапаможнікаў.

Актуальнай і эфектыўнай для бібліятэк з'яўляецца рэклама біябібліяграфічных рэсурсаў у Інтэрнэце. Так, многія бібліятэкі маюць свае сайты — выдатную пляцоўку для абвестак пра крыніцы біябібліяграфічнай інфармацыі. У раздзелах навін неабходна аператыўна інфармаваць карыстальніка аб падрыхтаваных біябібліяграфічных рэсурсах і запланаваных па іх прэзентацыях; у раздзеле аб фондзе бібліятэкі можна вылучыць падраздзел, прысвечаны біябібліяграфічным рэсурсам, дзе будзе не толькі адлюстравана наяўнасць, але і раскрыты іх значнасць і функцыянальны патэнцыял. Пільную ўвагу трэба аддаць сродкам распаўсюджанай сёння тэхналогіі Web 2.0, выкарыстанне якой скіравана на ўзаемадзеянне з карыстальнікам, сярод іх — анлайнавае

**Стваральнікі біябібліяграфічных рэсурсаў і бібліятэкары павінны праводзіць работу па іх папулярызацыі сярод настаўнікаў і навучэнцаў, удзельнічаць у падрыхтоўцы адпаведных метадычных дапаможнікаў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

відэа, сацыяльныя закладкі, паведамленні ў сацыяльных сетках. Блогасфера і вікі-даведнікі таксама з'яўляюцца пляцоўкамі для размяшчэння рэкламы ў фармаце Web 2.0, але эфектыўнай яна стане, калі акцэнт зрабіць на раскрыцці функцыянальнага патэнцыялу бібліяграфічнай інфармацыі.

Нярэдка біябібліяграфічная інфармацыя ў яе бібліяграфічнай частцы даволі цяжка ўспрымаецца дзецьмі, таму пры падрыхтоўцы паказальнікаў неабходна прымяняць розныя спосабы актывізацыі ўвагі, змяняць стыль выкладання матэрыялу, выкарыстоўваць гульнявыя прыёмы, разнастайныя ілюстрацыі, што здольна прыцягнуць і ўтрымаць зацікаўленасць маленькага чытача.

Біябібліяграфічная інфармацыя для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту павінна рэалізоўвацца ў малых выдавецкіх фарматах: памяткі, закладкі, лістоўкі, календары. Карысны ў гэтым плане з'яўляецца канцэпцыя Г. С. Ганзікавай па афармленні бібліяграфічных дапаможнікаў у выглядзе настольных гульняў, кніжак-цацак і г. д. [3]. Бібліёграф А. Я. Сматрова прапануе такую форму падачы біябібліяграфічнай інфармацыі, як бібліятрансформер, які будзе прыдатным у засваенні звестак пра жыццё і творчасць асобы ці калектыву [4].

Дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту зацікавяць дыялогавая форма падачы матэрыялу, камунікатыўныя магчымасці Інтэрнэта.

Падлеткі часцей выкарыстоўваюць электронныя формы бібліяграфічных дапаможнікаў, чым традыцыйныя. Да таго ж з электронным варыянтам зручна працаваць не толькі ў бібліятэцы, але і дома, у навучальных установах, школьных бібліятэках. Сёння ствараецца ўсё больш электронных мультымедыйных бібліяграфічных рэсурсаў для навучэнцаў, якія адкрываюць шырокія магчымасці для выбару патрэбных матэрыялаў.

***Вялікую ролю ў папулярызацыі біябібліяграфічных рэсурсаў для дзяцей і юнацтва адыгрывае арганізацыя рэспубліканскіх і рэгіянальных конкурсаў на складанне найлепшага біябібліяграфічнага даведніка. Неабходнай з'яўляецца і высакаякасная спецыялізаваная падрыхтоўка кадраў, а таксама пастаянна дзеючая сістэма павышэння кваліфікацыі бібліёграфаў дзіцячай літаратуры. А галоўнае — патрабуюцца актыўная творчая пазіцыя бібліятэкараў і бібліёграфаў, праца на вынік, пошук імі новых шляхоў развіцця бібліяграфічных рэсурсаў пры захаванні тых традыцый, на якіх трымаецца сёння бібліяграфія для дзяцей.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс цытаваных крыніц

1. *Томашева, Е. Н.* Рекомендательная библиография для детей в современных условиях / Е. Н. Томашева // Рекомендательная библиография и библиотечная практика : сб. ст. — М. : Пашков дом, 2007. — (Вопросы библиографоведения / РГБ, НИО библиографии. — Вып. 15). — С. 69—81.
2. *Бігеза, В. М.* Сістэма дапаможнікаў па беларускай дзіцячай літаратуры як сродак даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання / В. М. Бігеза // Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць : тэзісы дакладаў на навуковай канферэнцыі (18—19 красавіка 1996 г.) / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. — Мінск, 1997. — С. 85—87.
3. *Ганзикова, Г. С.* Библиографические игрушки / Г. С. Ганзикова // Книжки, нотки и игрушки для Катюшки и Андрюшки. — 2004. — № 6. — С. 48—53.
4. *Смотрова, Е. Е.* Живая библиография, или В поисках жанра / Е. Е. Смотрова // Библиотечное дело. — 2011. — № 16. — С. 42—44.